Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава”

**Я. Н. МАРОЗАВА**

Репозиторий ВГУ

# ПЛАНЫ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## па ”СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (МАРФАЛОГІЯ. Ч. 1: Іменныя часціны мовы)”

***Для студэнтаў III курса (5 семестр) ФБФК дз. / аддз.***

*Віцебск*
*УА ”ВДУ імя П. М. Машэрава”*
*2011*

# ПЛАНЫ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## па ”СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ” (МАРФАЛОГІЯ. Ч. 1)

**Складальнік – дац. Марозава Я.Н.**

## 2 КУРС, 4 СЕМЕСТР

## ТЭМА № 1

## ГРАМАТЫКА ЯК РАЗДЗЕЛ МОВАЗНАЎСТВА. ПРАДМЕТ ГРАМАТЫКІ. ГРАМАТЫЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ

### Дамашнія заданні да тэм № 1 і № 2:

1. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэм № 1 і № 2 і ўмець начарціць на дошцы дзве табліцы: ”Асноўныя граматычныя паняцці і тэрміны”, ”Граматычныя катэгорыі” (змешчаны ў лекцыі № 1).

2. Выканаць **практ. 275 (п.), 276 (п.)** па зборніку практычных заняткаў «Сучасная беларуская літаратурная мова: **Практ. заняткі / Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага.— 2-е выд.,** перапрац.— Мн.: Выш. шк., **1987**»

**Заўвага.** У далейшым №№ практыкаванняў прапануюцца па гэтым жа зборніку, назва **скарочана: ”СБЛМ: Практ. заняткі / Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага”.**

**У пр. 275** — прыдумаць кароткія сказы, якія адпавядалі б мэтам: 1) навучальнай мэце: ярка і даступна праілюстраваць моўную з’яву; 2) развіццёвай мэце: якія развівалі б уменне бачыць моўную з’яву ў тэксце і выкарыстоўваць яе ў сваёй мове; 3) узбагачэнню слоўнікавага запасу і звязнай мовы, пашырэнню кругагляду; 4) выхаваўчай мэце.

**У пр. 276 —** спісаць сказы, вызначыць часціну мовы выдзеленых слоў і вусна адказаць, якімі прынцыпамі размежавання слоў па часцінах мовы пры гэтым кіраваліся.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 1 і № 2:

1) Ксеракс лекцый № 1 і № 2 (папяровы варыянт знаходзіцца ў лабаранцкай № 603, электронны варыянт – у камп’ютары ў лабар. 603 у папцы ”Марозава”): **МАРОЗАВА Я. Н. ЛЕКЦЫІ ПА МАРФАЛОГІІ. Лекцыя № 1. Граматыка як раздзел мовазнаўства. Асноўныя граматычныя паняцці; Лекцыя № 2. Марфалогія як частка граматыкі. Сістэма часцін мовы ;**

2) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;

Репозиторий ВГУ

3) **Марозава Я. Н. Марфалогія. У 2-х ч. Ч. 1. Іменныя часціны мовы / Вучэбна-метадычны дапаможнік.** – Віцебск, Выд-ва УА ”ВДУ імя П.М. Машэрава”, **2005.** [ Узяць у бібліятэцы на абанеменце ці на сайце факультэта: www.fbfk.vsu.by а) Электронная бібліятэка; б) Бел. мова і бел. літаратура; в) у спісе літ. № 13 ]. Далей указанне на гэты дапаможнік **скарочана: Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.**

## Пытанні да тэмы № 1:

1. Што такое граматыка? (Даць азначэнне)

2. Што з’яўляецца прадметам вывучэння граматыкі ў адрозненне ад лексікалогіі?

3. З якіх частак складаецца граматыка?

4. Што вывучае марфалогія? Што вывучае сінтаксіс?

5. Назавіце асноўныя граматычныя паняцці і праілюструйце іх на прыкладах (Што такое граматычная форма? Што такое граматычнае значэнне? Што з’яўляецца больш шырокім паняццем — граматычная форма ці граматычнае значэнне? Што такое граматычныя сродкі? Што такое граматычная катэгорыя?)

## Літаратура да тэмы № 1:

1. № № 1; 5 або 4; 6 [**Нумары са ”Спіса літаратуры”** да 1-й і астатніх тэм гл. у дапаможніку: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя часціны мовы.**— Віцебск, 2005, **с. 38 - 39 ].**

2. Ксеракс электроннага варыянта лекцыі № 1: **Марозава Я.Н. Лекцыі па марфалогіі. Лекцыя № 1. Граматыка як раздзел мовазнаўства. Асноўныя граматычныя паняцці.**

3. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.** – С. 3-7 (вывучыць!), с. 7 - 9 (прачытаць, асэнсаваць).

# ТЭМА № 2

# МАРФАЛОГІЯ ЯК ГРАМАТЫЧНАЕ ВУЧЭННЕ АБ СЛОВЕ. ЧАСЦІНЫ МОВЫ ЯК ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ СЛОЎ. СІСТЭМА ЧАСЦІН МОВЫ

## Пытанні да тэмы № 2:

1. Што абазначае тэрмін ”марфалогія”? Што з’яўляецца яе прадметам? Якія яе задачы?

2. Што такое часціны мовы? Растлумачце гэта на прыкладах. Якія існуюць **прынцыпы вылучэння (размежавання) часцін мовы?**

Репозиторий ВГУ

3. На якія разрады падзяляюцца часціны мовы?

4. На якія разрады падзяляюцца паўназначныя (самастойныя) часціны мовы ў залежнасці а) ад ступені марфалагічнай самастойнасці і б) ад зменнасці?

5. Што такое **лексіка-граматычныя разрады слоў** і **лексіка-семантычныя групы слоў?** Прывядзіце прыклады.

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 1 і начарціць на дошцы дзве табліцы: ”Асноўныя граматычныя паняцці і тэрміны”, ”Граматычныя катэгорыі”.

2. Адказаць на пытанні да тэмы № 2.

3. Праверыць дамашнія практ. **№ № 275; 276** (вызначыць ч. м. выдзеленых слоў і вусна адказаць, якімі прынцыпамі размежавання слоў па часцінах мовы пры гэтым кіраваліся).

4. Выканаць пр. 278 (п.).

## Літаратура да тэмы № 2:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.), 16 (Д.).

2. Ксеракс электроннага варыянта лекцыі № 2: **Марозава Я.Н. Лекцыі па марфалогіі. Лекцыя № 2. Марфалогія як частка граматыкі. Сістэма часцін мовы.**

3. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.** – С. 3 - 7 (вывучыць), с. 7 - 9 (асэнсаваць).

# ТЭМА № 3

# НАЗОЎНІК. ЛГР НАЗОЎНІКАЎ: АГУЛЬНЫЯ І ЎЛАСНЫЯ, КАНКРЭТНЫЯ І АБСТРАКТНЫЯ, АСАБОВЫЯ І НЕАСАБОВЫЯ

## Дамашняе заданне да тэмы № 3:

1. Вучыць тэму № 3 па лекцыях і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 3.

2. **Пр. 277 (п.)** – вызначыць ч. м. выдзеленых слоў і падкрэсліць іх як члены сказа; **пр. 283 (п.)** – вызначыць лексіка-семантычныя групы назоўнікаў; **пр. 285 (в.)** – вызначыць агульныя і ўласныя назоўнікі; **пр. 287 (в.)** – вызначыць семантычныя падгрупы абстрактных назоўнікаў.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 3:

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.**

Рэпазіторый БГУ

## Пытанні да тэмы:

1. Чым адрозніваюцца уласныя назоўнікі ад агульных? Ці заўсёды "спрацоўвае" арфаграфічная прымета (напісанне з вялікай ці з малой літары) пры размежаванні агульных і ўласных назоўнікаў? Ці бываюць выпадкі, калі б арфаграфічная прыкмета не пацвярджала аднясенне назоўніка да разраду агульных або ўласных? Адказ абгрунтуйце прыкладамі.

2. Агульнымі ці ўласнымі з'яўляюцца выдзеленыя назоўнікі ў наступных сказах? Адказ абгрунтуйце.

*Калісьці мы шчыра верылі ў светлае* ***Заўтра****. У палітыку лезуць* ***сакаловы і слюньковы, дземянцеі і чыкіны.*** (З газет) *Закончыў* ***СШ*** *№ 20 г. Гомеля. Купілі* ***ЭВМ.*** *Чытаю "Чорны* ***замак*** *Альшанскі" У. Караткевіча. Сёння яшчэ не ўсе да канца ўсвядомілі жахлівыя вынікі* ***Курапатаў і ГУЛАГаў.*** (ЛіМ)

3. Якімі крытэрыямі трэба кіравацца пры адрозненні канкрэтных назоўнікаў ад абстрактных? Ці супадаюць граматычныя крытэрыі размежавання канкрэтных і абстрактных назоўнікаў з лексічным (семантычным) крытэрыем — здольнасцю ўспрымаць прадмет органамі пачуццяў?

4. Канкрэтнымі ці абстрактнымі з'яўляюцца назоўнікі: ***ААН; ЗБС; ЮНЕСКА;*** *узнікаюць новыя* ***партыі,*** *студэнцкія* ***арганізацыі;*** *ціхі* ***вечар;*** *цёплая* ***зіма;*** *светлая* ***раніца;*** *другі* ***год; стагоддзе*** ? Ці ўспрымаюцца яны органамі пачуццяў? Адказ абгрунтуйце.

5. Асабовымі ці неасабовымі з'яўляюцца выдзеленыя назоўнікі ў наступных прыкладах? Чаму?

*Дачку прынялі ў* ***скаўты. Натоўп*** *маўчаў. Сёння мой* ***саколік,*** *мая* ***лапка*** *прыедзе да мяне на "Пежо" ("Peugeot"). А мой* ***хамут*** *каторы дзень сядзіць дома.*

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 3.

2. Праверыць дам. **практ. 277 (п.) —** вызначыць ч. м. і сінт. функцыю слоў; **283 (в.) –** вызначыць лексіка-семантычныя групы наз.; **285 (в.)** – аг. і ўласныя наз.; **287 (в.) –** назваць семантычныя падгрупы абстрактных наз.

3. Выканаць **тэставыя заданні:**

1) Адзначце абстрактныя назоўнікі.
   1) партыя
   2) вецер
   3) прапіхванне
   4) авангард
   5) ГУЛАГ

2) Адзначце абстрактныя назоўнікі.
   1)штуршок
   2)гром
   3)сезон
   4)антракт
   5)сеанс

Репозиторий ВГУ

3) Адзначце канкрэтныя назоўнікі.
1)сухмень
2)паўстанне
3)мароз
4)раён
5)сон

4) Адзначце канкрэтныя назоўнікі.
1)белізна
2)пракорм
3)рубрыкацыя
4)ядловец
5)цемра

5) Адзначце канкрэтныя назоўнікі.
1)вылет
2)плён
3)пікет
4)каранцін
5)мурог

6) Адзначце асабовыя назоўнікі.
1)народ
2)натоўп
3)моладзь
4)скаўт
5)дэндзі

7) Адзначце абстрактныя назоўнікі.
1)праезд
2)прафесія
3)полаз
4)арганізацыя
5)усход

8) Адзначце канкрэтныя назоўнікі.
1)дышаль
2)золь
3)рубрыка
4)роспач
5)сухмень

9) Адзначце асабовыя назоўнікі.
1)атрад
2)сялянства
3)вясковец
4)скаўт
5)неслух

10) Адзначце неасабовыя назоўнікі.
1)моладзь
2)сяляне
3)натоўп
4)парцье
5)пранырa

● 11) Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца **агульнымі.**

*1)Калі касілі Лазовае* ***балота****, надвор'е спрыяла. (Л.Леванові*ч)

*2)...у Законе аб* ***мовах*** *павінен быць запіс: дзяржаўныя службоўцы аднолькава дасканала валодаюць беларускай і рускай мовамі.*

*3)Мары* ***манілавых, абломавых, галаўлёвых*** *адводзяць чалавека ад жыцця, засланяюць рэчаіснасць шэрай смугой фантазіі. (Зб. "Янка Купала")*

*4)Наведалі музей-памятнік "Ісаакіеўскі* ***сабор****".*

*5)У памяці народнай будуць вечна жыць* ***Заслонавы, Матросавы*** *і* ***Гастэлы****.*

● 12) Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца **уласнымі.**

*1)... гэтым жыве Яго Вялікасць* ***Чалавек****. (А. Русецкі)*

*2)****Аляксеі, Міколы*** *і* ***Мішы,*** *столькі вас пад ракіты лягло... (У. Паўлаў)*

*3)Ты рурскі пыл яшчэ не выдыхаў, і, мабыць, сняцца па начах жывыя мошчы* ***Янаў, Фрыдрыхаў*** *з адчаем у сухіх вачах. (Грах.)*

*4)Не, гэта плача мая душа па тысячах нашых* ***Лідзіц****. (А.Зарыцкі)*



Репозиторий ВГУ

*5)Пасля заканчэння школы ўсе мае аднакласнікі паступілі ў **<u>ВНУ</u>**.*

● <u>13</u>) Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя назоўнікі з'яўляюцца **<u>агульнымі</u>.**

*1)Ён быў узнагароджаны медалём "За **<u>адвагу</u>**".*

*2)Забурліла сіне мора ад віхроў, выйшлі **<u>Волгі</u>, <u>Дняпры</u>** выйшлі з берагоў. (Куп.)*

*3)На Новы **<u>год</u>** паедзем дамоў, у вёску.*

*4)...да самых далёкіх **<u>амерык</u>**. (Калачынскі)*

*5)Верыш ты розным **<u>нарбутовічам</u>** ды **<u>мартыневічам</u>**.* (Чарн.)

---

## <u>Літаратура</u> да тэмы <u>№ 3</u>:

1. № № 1; 5 або 4; 16 (Д.); Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.,** с. 9 - 12.

# <u>ТЭМА</u> <u>№ 4</u>

# <u>НАЗОЎНІК</u>. ЛГР: <u>АДУШАЎЛЁНЫЯ</u> І <u>НЕАДУШ</u>., <u>ЗБОРНЫЯ</u>, <u>РЭЧЫЎНЫЯ</u>. <u>РОД</u> І <u>ЛІК</u> <u>НАЗОЎНІКАЎ</u>

## <u>Дамашняе</u> <u>заданне</u> да тэмы <u>№ 4</u>:

1. Вучыць тэму № 4 па лекцыях і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 4.

2. **Пр. <u>289</u> (п.) –** утварыць словазлуч., указаць адуш. наз.; **пр. <u>300</u> (п.)** – перакласці словы на беларускую мову; **пр. <u>295</u> (п.)** – выпісаць адзіночна-лікавыя і множналікавыя назоўнікі; **291 (в.) –** назваць зборныя наз.; **пр. <u>298</u> (в.)** – знайсці адзіночналікавыя назоўнікі.

3. Вывучыць правіла, табліцу **"<u>Род</u> <u>назоўнікаў</u>" (!!!)** і іншыя табліцы, алгарытм у дапамож.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання** / Дапаможнік для слухачоў ФДП.— Віцебск: Выд-ва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2008, **<u>с. 67 - 68</u>, <u>72 - 74</u>. [Электрон. варыянт** дапамож. знаходзіцца **на <u>сайце</u> <u>факультэта</u>:** www.fbfk.vsu.by а) Электронная бібліятэка; б) Бел. мова і бел. літаратура; в) у спісе літ. № 17]. Далей дапамож. скарочана: **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008).**

<u>УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 4</u>:

1) **СБЛМ: <u>Практ</u>. <u>заняткі</u>** / Пад агул. рэд. <u>Ф.М. Янкоўскага</u>;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.;**
3) **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008).

## <u>Пытанні</u> <u>да</u> <u>тэмы</u>:

Репозиторий ВГУ

1. Што кладзецца ў аснову падзелу назоўнікаў на адушаўлёныя і неадушаўлёныя? Прывядзіце прыклады з дамашняга практ. 289.

2. Як граматычныя паняцці ’адушаўлёны / неадушаўлёны’ суадносяцца з біялагічнымі паняццямі ’жывое / нежывое’? Растлумачце на прыкладах.

3. Якімі крытэрыямі трэба кіравацца пры вызначэнні (вылучэнні) зборных назоўнікаў? Прывядзіце прыклады з дамашняга практ. 291.

4. Што агульнае характэрна для зборных і рэчыўных назоўнікаў? А чым яны адрозніваюцца?

5. Якія назоўнікі адносяцца да адзіночналікавых? Прывядзіце прыклады з дамашніх пр. 295 і 298. Што яны абазначаюць? Да якіх семантычных груп адносяцца гэтыя назоўнікі?

6. Якія назоўнікі з’яўляюцца множналікавымі? Прывядзіце прыклады з дам. пр. 295. Што могуць абазначаць множналікавыя назоўнікі?

7. Чым адрозніваюцца формы мн. ліку назоўнікаў ад адпаведных зборных назоўнікаў? (Гл. пр. 292)

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 4. Вусна выканаць **пр. 297.**

2. Праверыць дам. **пр. 300 (п.)** – перакласці словы на бел. мову.

3. Утварыце формы мн. ліку і формы зборнасці ад слоў *камень, колас, пяро, корань, бервяно, ліст* (пр. 296).

4. Выканаць наступныя тэставыя заданні і вусна абгрунтаваць адказы:

| | |
|---|---|
| 1) Адзначце рэчыўныя назоўнікі<br>1)звяр’ё<br>2)вуголле<br>3)смятана<br>4)азот<br>5)крэпдэшын | 4) Адзначце зборныя назоўнікі<br>1)кісель<br>2)міткаль<br>3)чарот<br>4)хмызняк<br>5)мінчане |
| 2) Адзначце зборныя назоўнікі<br>1)дубняк<br>2)рота<br>3)студэнты<br>4)цукар<br>5)зелле | 5) Адзначце адушаўлёныя назоўнікі<br>1)атрад<br>2)фікус<br>3)студэнцтва<br>4)чарвяк<br>5)лясун |
| 3) Адзначце рэчыўныя назоўнікі<br>1)антрацыт<br>2)галлё<br>3)асфальт<br>4)аксаміт<br>5)кісларод | 6) Адзначце зборныя назоўнікі<br>1)друз<br>2)сяляне<br>3)насельніцтва<br>4)крылле<br>5)табун |

Репозиторий ВГУ

| | |
|---|---|
| 7) Адзначце рэчыўныя назоўнікі<br>1)металалом<br>2)смецце<br>3)алей<br>4)ельнік<br>5)асфальт | 9) Адзначце рэчыўныя назоўнікі<br>1)шчолач<br>2)ламачча<br>3)духі<br>4)паркаль<br>5)цытрамон |
| 8) Адзначце зборныя назоўнікі<br>1)хвойнік<br>2)гараджане<br>3)насельніцтва<br>4)соль<br>5)атрад | 10) Адзначце адушаўлёныя назоўнікі<br>1)павадыр<br>2)сасна<br>3)моладзь<br>4)матрошка<br>5)табун |

5. Праверыць засваенне роду назоўнікаў з табліцы ”Род назоўнікаў” [**Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 67 - 68].

## Літаратура да тэмы № 4:

1. № № 1; 5 або 4; 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.,** с. 10 – 12.
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008).

# ТЭМА № 5
# КАТЭГОРЫЯ РОДУ НАЗОЎНІКАЎ

## Дамашняе заданне да тэмы № 5:

1. Вучыць тэму № 5 па лекцыі і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 5.

2. Паўтарыць правіла і цвёрда засвоіць род у прыкладах з табліцы **”Род назоўнікаў”** [**Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 67 - 68].

3. **Пісьмова** выканаць **заданні №№ 59 - 62** па дапам.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ ( 2008 ),** с. 74 – 75.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 5:

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3) **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008);
4) **Слоўнік беларускай мовы** / Пад рэд. М. В. Бірылы. – Мн., 1987.

## Пытанні да тэмы:

Репозиторий ВГУ

1. Як узнікла катэгорыя роду назоўнікаў? Чаму віды дрэў *бяроза* – ж. р., *дуб* – м. р., а агульная для іх родавая назва *дрэва* – н. р.? Чаму *сын* – м. р., *дачка* – ж. р., а *дзіця* – н. р.? Чаму *муха* – ж. р., а *камар* – м. р.? Чаму *поле* – н. р., а *абшар* – м. р.?

2. Якія назоўнікі адносяцца да агульнага роду?

3. Якія тыповыя памылкі звычайна дапускаюцца пры вызначэнні роду назоўнікаў тыпу а) *ціхоня, Багдановіч, Шура, Жэня прыйшла, Саша прыбег, плакса Іна;* б) *дырэктар Іванова, сакратар Пятрова, суддзя Арлова* ? Да якога роду адносяцца падкрэсленыя назоўнікі ?

4. Як (па чым) вызначаецца род нязменных запазычаных назоўнікаў? Пералічыце ўсе выпадкі. Якую тыповую памылку звычайна дапускаюць пры вызначэнні роду ўласных назоўнікаў тыпу *Севан, Балхаш, Свіцязь* (азёры), *Рэйн* (рака), *Уфа* (горад), *Макарычы* (вёска), *Сінгапур* (дзяржава)? Якога яны роду? Да якога роду адносяцца назоўнікі *Сі-бі-эн, Сі-эн-эн, парцье, салямі, івасі, Сочы, Гобі?*

5. Як вызначаецца род абрэвіятур?

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 5.

2. Праверыць дам. заданні з дапаможніка: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008) **№ № 59 - 62.**

3. Выканаць **5 - 9 сказы** з **пр. 304 (п.) —** вызначыць род наз. і ў дужках указаць, па чым вызначылі: а) па марф. адзнаках (г. зн. па канч); б) па семантыцы. Якая памылка дапушчана ва ўмове задання?

4. Выканаць **пр. 305 (п.)** – заданне аналагічнае, як і ў пр. 304.

5. Выканаць **пр. 307 (п.)** – вызначыць род абрэвіятур; **пр. 313 (в.)** – вызначыць род назоўнікаў у сказах і ўставіць канчаткі залежных слоў.

## Літаратура да тэмы № 5:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыя.
2. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 67 - 68, 72 - 75.
3. **Слоўнік беларускай мовы** / Пад рэд. М. В. Бірылы. – Мн., 1987.

# ТЭМА № 6

# КАТЭГОРЫЯ РОДУ НАЗОЎНІКАЎ (працяг)

## Дамашняе заданне да тэмы № 6:

1. Вучыць тэму № 6 па лекцыі і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 6.

Репозиторий ВГУ

2. **Пр. 306 (п.)** – падабраць да запазычаных назоўнікаў азначэнні і вызначыць род (пры неабходнасці карыстацца ТСБМ у 5 т. і ”Слоўнікам іншамоўных слоў” А.М. Булыкі); вусна растлумачыць, чаму аднеслі кожны назоўнік да таго ці іншага роду; **пр. 309 (п.)** – перакласці словазлучэнні на бел. мову і вызначыць род назоўнікаў у рускай і беларускай мовах.

3. **Заданне № 63 (п.)** выканаць па дапамож.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008) – перакласці на бел. мову словы, якія адрозніваюцца ў беларускай і рускай мовах родам ці лікам.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 6:

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3) **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008);
4) **Марозава Я. Н. Тэсты па беларускай мове** / Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філфакаў.– Віцебск: Выд-ва УА ”ВДУ імя П.М. Машэрава”, **2002** [ Далей гэты дапаможнік **скарочана: Марозава Я.Н. Тэсты па бел. мове** ]. Ёсць на абанеменце ў бібліятэцы.

## Пытанні да тэмы:

1. Як вызначаецца род у назоўнікаў, ужытых у клічнай форме?
2. Чым адрозніваюцца адзінкавыя назоўнікі ад адзіночналікавых?
3. Прывядзіце як мага больш слоў, якія адрозніваюцца родам і лікам у беларускай і рускай мовах.

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 6.
2. Праверыць дамашняе **заданне № 63 (п.)** з дапамож.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ; пр. 306 (п.)** – падабраць да запазычаных назоўнікаў азначэнні і вызначыць род; **пр. 309 (п.) –** перакласці рускія словазлучэнні на беларускую мову.
3. Выканаць па 7 варыянтаў тэставых заданняў **№ № 12 і 13** з вучэбнага дапаможніка: **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове,** с. 14 -15.

## Літаратура да тэмы № 6:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыя.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 23.
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 67 - 68, 72 - 76.
4. **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**
5. **Слоўнік беларускай мовы** / Пад рэд. М. В. Бірылы. – Мн., 1987.

Репозиторий ВГУ

# ТЭМА № 7

# КАТЭГОРЫІ СКЛОНУ І СКЛАНЕННЯ НАЗОЎНІКАЎ

## Дамашняе заданне да тэмы № 7:

1. Вучыць тэму № 7 па лекцыях і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 7.

2. Вывучыць **5 табліц:** ”Тыпы скланення назоўнікаў” і ”Склонавыя канчаткі назоўнікаў” – табл 1, 2, 3, 4 на **с. 24, 25, 29** і каментарыі да іх на с. 26 - 31 у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.**

3. **Пр. 314 , ч. І, ІІ (п.)** – пры спісванні вызначыць склон назоўнікаў і ў дужках даказаць правільнасць вызначэння склону шляхам падстаноўкі назоўніка ж. р. 1-га склан. адз. л.

4. **Заданні № № 65, 66, 67 (п.)** выканаць па дапамож.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008).** (Паставіць назоўнікі ў Д, Т., М. склоны строга па ўзорах)

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 7:

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.;**
3) **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008).

## Пытанні да тэмы:

1. Што новага даведаліся з лекцыі і вучэбнай літаратуры пра катэгорыю склону назоўнікаў у параўнанні з тым, што ведалі пра яе са школы?

2. Пералічыце склонавыя значэнні і праілюструйце іх на прыкладах.

3. Што такое клічная форма? Як пры марфалагічным разборы характарызаваць склонавую форму назоўнікаў, што стаяць у клічнай форме? (Гл. пр. 318)

4. Якім практычным прыёмам трэба карыстацца, каб хутка і беспамылкова вызначаць форму склону назоўнікаў і іншых скланяльных часцін мовы, калі канчаткі ў некалькіх склонах супадаюць?

Вызначце склон назоўнікаў і займеннікаў у наступных словазлучэннях: *быў у яго; быў у брата; падышоў к сястры; гаварыў пры брату; гуляў з ім; сядзеў пры ім; сустрэў яго; не было яго; бачыў сына; ішлі без сына.*

5. Як практычна хутка і лёгка вызначыць склонавае значэнне нязменных назоўнікаў?

6. Якія асаблівасці сістэмы скланення ў беларускай мове? Колькі ўсіх тыпаў скланення? Прывядзіце прыклады на ІІ і ІІІ тыпы скланення.

Репозиторий ВГУ

7. Якія падтыпы субстантыўнага скланення вылучаюцца ў беларускай мове? Прывядзіце прыклады на кожны падтып.

8. Якія асаблівасці скланення імён, прозвішчаў у беларускай мове ў параўнанні з рускай?

9. Ад чаго залежыць правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў? [ Гл. табліцы № № 1, 2, 3, 4 і правіла на с. 76 - 77 у дапамож.: Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008) ]

10. Якія канчаткі маюць назоўнікі 1-га склан. на *-а (-я)* і рознаскланяльныя назоўнікі на *-а (-я)* у Д., Т., М. склонах? (Гл. табліцы № № 1 і 2)

11. Якія канчаткі маюць назоўнікі м. р. 2-га склан. з чыстай асновай у М. склоне? (Гл. табліцы № № 3 і 4)

## **Аўдыторныя заданні:**

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 7.

2. Праверыць дамашнія **заданні №№ 65, 66, 67 (п.)** з дапамож.: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ** (Паставіць назоўнікі ў Д, Т., М. склоны).

3. Праверыць дамашнія **пр. 314 ч. I, II (п.) –** вызначыць склон наз-каў.

4. Выканаць **пр. 321 (в.)** – раскрыць дужкі і ўтварыць словазлучэнні; **пр. 324 (п.)** – запісаць назоўнікі ў М. склоне і вусна растлумачыць правапіс канчаткаў; **пр. 323 (в.)**

## **Літаратура да тэмы № 7:**

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 15 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м.,** с. 24 - 31.
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 67 - 73.
4. **Слоўнік беларускай мовы** / Пад рэд. М. В. Бірылы. – Мн., 1987.

# **ТЭМА № 8**

# **КАТЭГОРЫЯ СКЛАНЕННЯ НАЗОЎНІКАЎ (працяг)**

## **Дамашняе заданне да тэмы № 8:**

1. Вучыць тэму № 8 па лекцыі і па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 8.

2. Вывучыць тэму **”Канчаткі назоўнікаў м. р. 2-га склан. у Р. склоне адз. ліку”** па лекцыі і па дапаможніку: **Марозава Я.Н. Рыхтуемся да ЦТ** (с. 76 - 77); выканаць у ім заданні **№ № 64, 68, 69** строга па ўзоры.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 8:



Репозиторий ВГУ

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м. (2005);
3) **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008).

## Пытанні да тэмы:

1. Чым абумоўлены выбар канчатка ***-а (-я)*** або ***-у (-ю)*** у назоўнікаў м. р. адз. л. у Р. склоне?

2. Пералічыце ўсе падгрупы назоўнікаў м. р. адз. л., якія маюць канчатак ***-у (-ю)*** у Р. склоне.

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 8.

2. Праверыць дам. **заданні** з дапамож.: **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ: №№ 64, 68** – паставіць назоўнікі ў Р. склон і абгрунтаваць выбар канчаткаў; **заданне 69** – выправіць граматычныя памылкі.

3. Выканаць **пр. 322 (п.)** – паставіць словазлучэнні ў Р. склон; вусна растлумачыць выбар канчаткаў; **пр. 320 (п.)** – запісаць назоўнікі 2-га склан. у Р. склоне і вусна растлумачыць выбар канчатка.

## Літаратура да тэмы № 8:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 15 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыя.
2. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 76 - 77.
3. **Слоўнік беларускай мовы** / Пад рэд. М. В. Бірылы. – Мн., 1987.

# ТЭМА № 9

# ПОЎНЫ МАРФАЛАГІЧНЫ РАЗБОР НАЗОЎНІКАЎ

## Дамашняе заданне да тэмы № 9:

1. Вучыць тэму № 9 па ўказанай літаратуры. Падрыхтаваць вусныя адказы на заданні да тэмы № 9.

2. Вызубрыць **”Парадак і ўзоры марфалагіч. разбору назоўніка”** з дапам.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м. (2005), с. 9 - 12.

3. **Пр. 318,** сказы **1, 2, 4, 5 (п.),** сказ **6 (в.);** – зрабіць поўны разбор наз-ў строга па ўзорах з дапамож.: **Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м. (2005).

4. Выканаць **пр. 339 (п.)** – зрабіць поўны марфалагічны разбор назоўнікаў (строга па ўзорах з дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.) у наступных прыкладах: *Маладосць цягнецца да незвычайнага; у горадзе Казлове; столькі спроб; гэта гаворыцца да таго…* Не забывайце выпісваць **дастатковы для разбору кантэкст!!!**



Репозиторий ВГУ

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 9:

1) **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2) **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3) **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

## Пытанні да тэмы:

1. Раскажыце пра ЭТАПЫ МАРФАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ самастойных ч. м. (гл. с. 3 - 6 дапамож.: **Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.).

2. Назавіце ТРЫ ВАРЫЯНТЫ ЗА́ПІСАЎ пры МАРФАЛАГІЧНЫМ РАЗБОРЫ самастойных ч. м. (гл. с. 6 там жа).

3. Назавіце тыповыя недахопы і памылкі пры марфалагічным разборы назоўніка, пералічыце складаныя выпадкі (гл. с. 7 - 12 там жа).

4. Якія агульнапрынятыя ў лінгвістыцы скарачэнні можна прымяняць пры пісьмовым разборы ч. м.?

**Запомніць:** пры пісьмовым разборы ч. м. **нельга скарачаць: вык.** (выказнік, выклічнік, выконвае); **дап.** (дапаўненне, дапасуецца, дапасаванае); **ф-ю, ф-цыю, ф.** (функцыю); **ф.** – гэта агульнапрынятае ў лінгвістыцы скарачэнне слова форма!!!); **с.** (склон, скланенне); **с.** – гэта агульнапрынятае ў лінгвістыцы скарачэнне слова **с**таронка!!!

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 9.

2. Праверыць дамашнія **заданні пр. 318,** сказы **1, 2, 4, 5 (п.),** сказ **6 (в.); пр. 339 (п.)** – поўны марфал. разбор назоўнікаў.

4. Выканаць тэставыя заданні **№ № 19 - 21** па дапаможніку: **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове** (усе 6 варыянтаў).

5. Зрабіць поўны марфалагічны разбор назоўнікаў (астатнія ч. м. прапусціць) з варыянта 1 КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 1 у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 20.

## Літаратура да тэмы № 9:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 15 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.
3. **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

## ТЭМА № 10

## КАНТРОЛЬНАЯ РАБОТА № 1

## ТЭМА: ЛГР НАЗОЎНІКАЎ. Р., Л., СКЛ., СКЛАНЕННЕ

Репозиторий ВГУ

## Дамашняе заданне да тэмы № 10:

1. Вывучыць тэму № 10 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.

2. З пр. 340 (п.) зрабіць поўны марфалагічны разбор наступных назоўнікаў: *”Пана Тадэвуша” А. Міцкевіча; Наваградчыны; ніхто з вялікіх; прастатою; Свіцязі.*

3. Зрабіць поўны марфалагічны разбор падкрэсленых назоўнікаў са сказаў: *У ЛіМе за 22 кастрычніка 1993 г. надрукавана заява прэс-цэнтра БЗВ. Поле ціхае маўчыць сіратой забытай (К-с). Прыйшоў ад Бярозкі Люды і сядзеў у Іванова. На Дзяды пойдзем у Курапаты. Успомнілі былое, дарагое, мінулае. Ну, колькі тут дапаможа маё маленькае ”ўра”? (Брыль)*

4. Выканаць астатнія варыянты тэстаў (якія раней недавыканалі) па тэме ”Назоўнік” з дапаможніка: **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове** (заданні № № 12 - 21, с. 14 - 19).

5. Выканаць **электронны варыянт** ПРОБНАГА ТЭСТА **”ЛГР назоўнікаў. Р., л., скл., скланенне”** (у камп’ютарах у праграме Moodle).

6. Падрыхтавацца **да электроннага варыянта** тэставай КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ **№ 1 ”ЛГР назоўнікаў. Р., л., скл., скланенне”** (у камп’ютарах у праграме Moodle).

Падрыхтаваць выкладчыку пытанні па дамашніх заданнях (калі ў чым.-н. сумняваліся ці што-н. не зразумелі).

## Аўдыторныя заданні:

1. Перад пачаткам к. / р. задаць выкладчыку пытанні, калі што-н. не зразумелі ў дамашніх заданнях.

2. Выканаць электронныя варыянты **тэставай** КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ **№ 1** па тэме **”ЛГР назоўнікаў. Р., л., скл., скланенне”** (у камп’ютарах у праграме Moodle).

## Літаратура да тэмы № 10:

1. № № 1; 5 або 4; 13 (Д.); 15 (Д.); 16 (Д.); 18 (Д.); Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.
3. **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

# ТЭМА № 11

## ПРЫМЕТНІК. ЛЕКСІКА - СЕМАНТЫЧНЫЯ ГРУПЫ. ЛГР

## Дамашняе заданне да тэмы № 11:

1. Вучыць тэму № 11 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.



Рэпазіторый ВДУ

2. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 11.

3. **Пр. 349 (п.)** – выпісаць словазлуч. назоўнікаў з прыметнікамі (ці шырэйшы кантэкст, калі неабходна) і вызначыць **лексіка-граматычны разрад** прыметнікаў, у дужках запісаць доказ-разважанне: калі 1) ўласна-прыналеж. – *належыць… (каму?)*; 2) калі адносна-прыналеж. – *характэрны для… (каго?), такі, як у… (каго?)*; 3) калі адносны – (абазначае) *адносіны да… (чаго?)*; 3) калі якасны – *абазначае… (што?)*, а лепш замяніць сінонімам (антонімам) – якасным прыметнікам ці запісаць іншую прымету якасных прыметнікаў. **Пр. 348 (п.)** – заданне аналагічнае, як і ў пр. 349.

4. **Пр. 341 (в.)** – вызначыць лексіка-семантычныя групы прыметнікаў.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 11:

**СБЛМ: Практ. заняткі** / Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;

## Пытанні да тэмы:

1. Што называецца прыметнікам? У якім сэнсе трэба разумець словы прымета прадмета — у вузкім ці ў шырокім? Якія прыметы могуць абазначаць прыметнікі? Пералічыце лексіка-семантычныя групы прыметнікаў з прыкладамі з дам. пр. 341 (в.).

2. Якія класіфікацыйныя прынцыпы трэба ўлічваць пры размежаванні слоў па часцінах мовы? У адпаведнасці з гэтымі прынцыпамі вызначце часціну мовы падкрэсленых слоў: *надзеў новае галіфэ; была ў спадніцы бэж; купіла касцюм колеру хакі; зноў у моду ўвайшлі клёш*.

3. На якія лексіка-граматычныя разрады падзяляюцца прыметнікі? Прывядзіце прыклады. Якія тыповыя памылкі дапускаюць пры вызначэнні ЛГР прыметнікаў?

4. Ці можна дакладна вызначыць разрад прыметніка не ў сказе і не ў словазлучэнні, без кантэксту? Чаму? Адказ праілюструйце прыкладамі.

5. Прывядзіце прыклады пераходу прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.

6. Якія асаблівасці выражэння прыналежнасці ў беларускай мове ў параўнанні з рускай? Як перакласці на бел. мову словазлучэнні тыпу: *полушубок отца, тетрадь Вити, произведение Брыля*?

7. Якую памылку пад уплывам рускай мовы дапускаюць часта пры ўтварэнні прыналежных прыметнікаў? Перакладзіце на беларускую мову прыметнікі *Мишин, Петин, Серёжин, Катин, Машин*.

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 11.



Репозиторий ВГУ

2. Праверыць разбор назоўнікаў з дамашняга **пр. 340 (п.)** і са скáзаў да тэмы № 10.

3. Праверыць дам. **пр. 349, 348** – вызначыць ЛГР прыметнікаў.

4. Выканаць **пр. 342 (п.)** – вызначыць ЛГР прыметнікаў у кароткім кантэксце і запісаць доказ-разважанне.

## Літаратура да тэмы № 11:

1. № № 1; 5 або 4; Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 13 - 14.

# ТЭМА № 12

# ПРЫМЕТНІК. ПОЎНЫЯ, КАРОТКІЯ, УСЕЧАНЫЯ ФОРМЫ. СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ. СКЛАНЕННЕ

## Дамашняе заданне да тэмы № 12:

1. Вучыць тэму № 12 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.
2. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 12.
3. **Пр. 352 (п.)** – вызначыць форму прым. (поўная, кар., усеч.) і іх функцыю.
4. **Пр. 361 (п.)** – запісваць сказы **ў 2 слупкі:** злева ў слупку НЯПРАВІЛЬНА запісаць сказы і падкрэсліць памылковыя формы ступеней параўнання прыметнікаў; справа ў слупку ПРАВІЛЬНА выправіць памылкі.
5. **Пр. 350 (в.) –** утварыць словазлучэнні і вызначыць разрад прыметнікаў-паронімаў.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 12:

1. **СБЛМ: Практ. заняткі /** Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.
3. **Русско-белорусский словарь: В 2-х т.—** 2-е изд.— Мн.: БелСЭ, 1982 (або: в 3-х т.— 4-е изд.— 1993).

## Пытанні да тэмы:

1. Пералічыце крытэрыі адрознення ўсечаных (сцягнутых) формаў прыметнікаў ад кароткіх. Прывядзіце прыклады.
2. Якая пашыранасць кароткіх прыметнікаў у беларускай мове ў параўнанні з рускай?
3. Як утвараюцца простыя і складаныя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання?

Репозиторий ВГУ

4. Якія прыметнікі не ўтвараюць складаных формаў ступеней параўнання? Якія не ўтвараюць простых і складаных формаў? Прывядзіце прыклады з пр. 355.

5. Прывядзіце прыклады на кожны тып скланення прыметнікаў.

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 12.
2. Праверыць **пр. 342 (п.) –** вызначыць ЛГР прым.; праверыць дамашнія **пр. 352 (п.)** – вызначыць форму прым. (поўная, кар., усеч.) і іх функцыю; **361 (п.)** – запісы ў слупку ПРАВІЛЬНА – выпраўленыя памылкі; **пр. 350 (в.) –** утварыць словазлучэнні і вызначыць разрад прыметнікаў-паронімаў.
3. Выканаць **пр. 360 (п.) –** запісаць сказы па-руску і перакласці іх на беларускую мову.
4. Зрабіць поўны марфалагічны разбор прыметнікаў з пр. 353 (п.): сказы № 6 (*найбольш вядомымі*), і № 9 (*найбольшай*); з пр. 349 (п.): сказы № 1 (*язіныя*), № 3 (*жураўліны*), № 4 (*жураўліны*), № 8 (*арліны*); з пр. 348 (п.): сказ № 9 (*быкаўскай*); з пр. 375 (п.): сказ № 1 ( *старэйшых*, *Заходняй* ).
5. Выканаць **пр. 359 (в.) –** назваць прыметнікі з суфіксамі *-ейш-*, *-эйш-*, *-ш-*, якія не маюць значэння вышэйшай ступені параўнання.

## Літаратура да тэмы № 12:

1. № № 1; 5 або 4; Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 13 - 14, 32 - 34.

# ТЭМА № 13

# ПОЎНЫ МАРФАЛАГІЧНЫ РАЗБОР ПРЫМЕТНІКАЎ І НАЗОЎНІКАЎ. ЛІЧЭБНІК ЯК Ч. М. РАЗРАДЫ ЛІЧЭБНІКАЎ

## Дамашняе заданне да тэмы № 13:

1. Вучыць тэму № 13 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.
2. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 13.
3. Вывучыць парадак і асэнсаваць узоры разбору прыметнікаў у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.; с. 13 - 14.
4. Зрабіць поўны марфалагічны разбор назоўнікаў і прыметнікаў (астатнія ч. м. прапусціць) з КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 1, змешчанай у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 20 - 22 (па тры варыянты на выбар кожнаму студэнту).

Репозиторий ВГУ

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 13:

1. **СБЛМ: Практ. заняткі** / Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008);
4. **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

## Пытанні да тэмы:

1. Як характарызуецца пры марфалагічным разборы форма нязменных назоўнікаў і прыметнікаў?

2. Як вызначаюцца і як характарызуюцца (пры пісьмовым марфалагічным разборы) катэгорыі роду, ліку, склону нязменных прыметнікаў? А катэгорыі ліку і склону нязменных назоўнікаў?

3. Якія тыповыя памылкі можна дапусціць пры характарыстыцы сінтаксічнай ролі ў сказе назоўнікаў і прыметнікаў?

4. Якія тыповыя памылкі можна дапусціць пры характарыстыцы сінтаксічнай сувязі з назоўнікам у нязменных прыметнікаў?

5. Якія тыповыя памылкі можна дапусціць пры характарыстыцы ліку, роду, скланення назоўнікаў (у тым ліку і назоўнікаў-субстантыватаў)?

Знайдзіце адказы на гэтыя і іншыя пытанні ў дапаможніку: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 4 - 14.

6. Якія вы ведаеце розныя падыходы ў вучоных да лічэбнікаў як часціны мовы (у прыватнасці, розныя класіфікацыі ЛГР лічэбнікаў)?

7. Даючы азначэнне лічэбніка як часціны мовы, якую тыповую памылку часта дапускаюць школьнікі, студэнты і нават дыпламаваныя спецыялісты? Чаму нельга сцвярджаць, што словы *два, тры, чатыры, шэсць* у наступных сказах — гэта пераход лічэбнікаў у назоўнікі?

*Два ў тры – будзе шэсць. Два плюс чатыры – будзе шэсць. Тры менш за шэсць.*

8. На якія разрады дзеляцца лічэбнікі па традыцыйнай класіфікацыі? Што такое няпэўна-колькасныя словы? Якія гэта часціны мовы?

9. Якога разраду лічэбнікі 40, 90, 11 - 19 паводле структуры і паводле ўтварэння? Пра якіх *сороков* пяе Уладзімір Высоцкі ў адной са сваіх песень: ”*А сроку было сорок сороков*”? Што яднае *сарочку* і лічэбнік *40* ?

## Аўдыторныя заданні:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 13.

2. Праверыць поўны марфалагічны разбор назоўнікаў і прыметнікаў з КАНТР. РАБОТЫ № 1 (**Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 20 - 22).

Репозиторий ВГУ

3. Выканаць **заданне 70** (пераклад ска́заў з прым.) і **заданне 71** (знайсці ў сказах граматыч. памылкі) з дапамож.: **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008), с. 82.

4. Выканаць **пр. 375 (в.)** – зрабіць поўны разбор прыметнікаў.

5. Выканаць **заданні № 22 - 25** з дапамож.: **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

## <u>Літаратура</u> да тэмы <u>№ 13</u>:

1. № № 1; 5 або 4; 6Д; 8Д; Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 4 - 14, 32 - 34.

## <u>ТЭМА</u> <u>№ 14</u>

## СІНТАКСІЧНАЯ СУВЯЗЬ ЛІЧЭБНІКАЎ З НАЗОЎНІКАМІ. СКЛАНЕННЕ, СІНТАКСІЧНАЯ РОЛЯ Ў СКАЗЕ. ПЕРАХОД У ІНШЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ. <u>ПОЎНЫ</u> <u>РАЗБОР</u> <u>ЛІЧЭБНІКАЎ</u>

## <u>Дамашняе</u> <u>заданне</u> да тэмы <u>№ 14</u>:

1. Вучыць тэму № 14 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.
2. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 14.
3. Вывучыць парадак і асэнсаваць узоры разбору лічэбнікаў у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.; с. 14 - 17.
4. Выканаць **пр. 380 (п.)** – падзяліць лічэбнікі на марфемы сімваламі (з улікам сінхраніі мовы).
5. Запісаць наступныя лічбы словамі: *$^2/_5$ ; 898; 999-ы; 0,1; 1,5; $^2/_4$ ; $^4/_5$; 969-ы; 17,3.*
6. Запісаць словамі лічэбнікі разам з назоўнікамі ў **Т.** і **М.** склонах:

**<u>Т</u>.** *792 гектары; 652 тысячы літраў; 280 метраў*

**<u>М</u>.** *$12^1/_{10}$ мільён(а,-аў) рублёў; 998 даляраў; 352 ракі*

7. **Пр. 378 (в.)** – вызначыць ч. м. і разрад аднакарэнных слоў; **пр. 382 (в.)** – вызначыць сінт. ролю лічэбнікаў у сказах; **пр. 393 (в.)** – вызначыць пераход лічэбніка *адзін* у іншыя часціны мовы.

<u>УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 14</u>:

1. **СБЛМ: <u>Практ</u>. <u>заняткі</u>** / Пад агул. рэд. <u>Ф.М. Янкоўскага</u>;
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008).

Рэпазіторый ВДУ

## <u>Пытанні</u> <u>да</u> <u>тэмы</u>:

1. Раскажыце пра ўсе выпадкі **<u>сінтаксічнай</u> <u>сувязі</u> <u>лічэбнікаў</u> <u>з</u> <u>назоўнікамі</u>** [гл. дапамож.: Марозава Я.Н. Марфалогія. Ч. 1. Іменныя ч. м., **с. 35-37**, а таксама <u>схему</u> ”<u>РУКА</u>” на **<u>с. 85</u>** дапамож.: Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008)].

2. Якія асаблівасці скланення складаных, састаўных, дробавых, парадкавых лічэбнікаў?

3. Якія тыповыя памылкі дапускаюцца пры скланенні лічэбнікаў *два, абодва, дзве, абедзве, дзвесце, паўтара, паўтары, сто, дзевяноста?*

4. Якая асноўная асаблівасць сінтаксічнай ролі лічэбнікаў у сказах?

5. Якая сінтаксічная сувязь існуе паміж словамі ў межах дробавых лічэбнікаў?

6. Прывядзіце прыклады пераходу лічэбніка *адзін* у іншыя ч. м. з дамаш. **пр. 393 (в.).** Што трэба ўлічваць пры вызначэнні пераходу лічэбнікаў у іншыя ч. м. ?

## <u>Аўдыторныя</u> <u>заданні</u>:

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 14.

2. Праверыць дамаш. **пр. 380 (п.)** – падзяліць лічэбнікі на марфемы сімваламі (з улікам сінхраніі мовы); **пр. 378 (в.)** – вызначыць ч. м. і разрад аднакарэнных слоў; **пр. 382 (в.)** – вызначыць сінт. ролю лічэбнікаў.

3. Праверыць дам. <u>заданне</u>: Запісаць лічбы словамі: $^{2}/_{5}$ *; 898; 999-ы; 0,1; 1,5;* $^{2}/_{4}$*;* $^{4}/_{5}$*; 969-ы; 17,3.*

4. Праверыць дам. <u>заданне</u>: Запісаць словамі лічэбнікі разам з назоўнікамі ў **Т.** і **М.** склонах:

**<u>Т</u>.** *792 гектары; 652 тысячы літраў; 280 метраў*

**<u>М</u>.** *12*$^{1}/_{10}$ *мільён(а,-аў) рублёў; 998 даляраў; 352 ракі*□

5. Праверыць дам. **пр. 393 (в.)** – пераход лічэбніка *адзін* у іншыя ч. м.

6. У наступных словазлучэннях закрэсліць няправільныя канчаткі:

*Тры чацвёрт(-ых, -ыя) вады. Два высок(-іх, -ія) дрэўц(-а, -ы). Дзве тонк(-іх, -ія) галін(-ак,-кі). Тры малад(-ых, -ыя) клёнік(-а, -і). Два (дзве) трэц (-іх, -ія) пяску. Дв(-а, -ое) ягня(-ты, -ці, -т). Дв(-а, -ое) парася(-ты, -ці, -т).*

7. Выканаць **заданні № 72 , 73, 76 (п.)** з дапамож.: **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008).**

8. Пачаць выконваць **пр. 394 (п.)** – поўны разбор лічэбнікаў.

## <u>Літаратура</u> да тэмы <u>№ 14</u>:

1. № № 1; 5 або 4; Лекцыі.

2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 14 - 17, 35 - 37.

Репозиторий ВГУ

# ТЭМА № 15

## ЗАЙМЕННІК. РАЗРАДЫ; ПЕРАХОД У ІНШЫЯ Ч. М. І НААДВАРОТ; ПОЎНЫ РАЗБОР ЗАЙМЕННІКАЎ

## Дамашняе заданне да тэмы № 15:

1. Вучыць тэму № 15 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.
2. Падрыхтаваць вусныя адказы на пытанні да тэмы № 15.
3. Вывучыць парадак і асэнсаваць узоры разбору займеннікаў у дапамож.: **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.; с. 17 - 19.
4. Прадоўжыць выкананне **пр. 394 (п.)** – поўны разбор наступных лічэбнікаў (выпісаць іх з дастатковым для разбору кантэкстам): *1,2 тысячы арганізацый; 35 тысяч камуністаў; 1,5 тысячы; 100 тысяч падпольшчыкаў*. У частцы II зрабіць вусна разбор наступных лічэбнікаў: *трох ступеняў; больш за 40 воінаў; прадстаўнікі больш як 70 нацыянальнасцей; у палку № 121.*
5. Выканаць **пр. 409 (п.)** – пераход займеннікаў у іншыя ч. м. і наадварот (абазначыць ч. м. выдзеленых слоў).
6. **Пр. 404 (в.)** – паставіць займеннік *сябе* ў адпаведным склоне.

УЗЯЦЬ НА ЗАНЯТКІ № 15:

1. **СБЛМ: Практ. занняткі** / Пад агул. рэд. Ф.М. Янкоўскага;
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м.;
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ** (2008);
4. **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове.**

## Пытанні да тэмы:

1. На якія разрады падзяляюцца займеннікі паводле суадносі з часцінамі мовы? Як практычна вызначаецца гэты разрад? Якімі граматычнымі ўласцівасцямі валодаюць займеннікі кожнага з гэтых разрадаў?
2. На якія ЛГР падзяляюцца займеннікі? Пералічыце па памяці ўсе займеннікі з кожнага разраду.
3. У якія ч. м. часцей за ўсё могуць пераходзіць займеннікі? Прывядзіце прыклады з дам. пр. 409 (п.).
4. Прывядзіце прыклады пераходу іншых ч. м. у займеннікі.
5. Якія тыповыя памылкі звычайна дапускаюць пры марфалагічным разборы займеннікаў адносных, прыналежных *яго, яе, іх,* няпэўных, асабовых, зваротнага?

## Аўдыторныя заданні:



Репозиторий ВГУ

1. Адказаць на пытанні да тэмы № 15.

2. Праверыць дам. **пр. 394 (п.)** – поўны разбор лічэбнікаў *1,2 тысячы арганізацый; 35 тысяч камуністаў; 1,5 тысячы; 100 тысяч падпольшчыкаў*. У частцы II – вусны разбор лічэбнікаў: *трох ступеняў; больш за 40 воінаў; прадстаўнікі больш як 70 нацыянальнасцей; у палку № 121.*

3. Праверыць дам. **заданне <u>№ 74</u> (п.)** з дапамож.: **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008)** – усе варыянты.

4. Выканаць **заданні № 26 - 32** з дапамож: **Марозава Я. Н. Тэсты па бел. мове,** с. 23-30.

## <u>Літаратура</u> да тэмы <u>№ 15</u>:

1. № № 1; 5 або 4; Лекцыі.
2. **Марозава Я. Н. Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 17 - 19, 37.
3. **Марозава Я. Н. Рыхтуемся да ЦТ (2008),** с. 87 - 88.

# <u>ТЭМА № 16</u>

# <u>КАНТРОЛЬНАЯ РАБОТА № 2</u>

# ТЭМА: <u>ПРЫМЕТНІК</u>, <u>ЛІЧЭБНІК</u>, <u>ЗАЙМЕННІК</u>

## <u>Дамашняе заданне</u> да тэмы <u>№ 16</u>:

1. Вывучыць тэму № 16 па лекцыях і па ўказанай літаратуры.

2. **Пр. 410 (п.)** – поўны разбор займеннікаў.

3. Зрабіць поўны марфалагічны разбор лічэбнікаў і займеннікаў з КАНТР. РАБОТЫ № 1 (**Марфалогія. Ч. 1.** Іменныя ч. м., с. 20 - 22) – тры варыянты (на выбар) пісьмова і тры – вусна.

4. Выканаць **электронны варыянт** <u>ТРЭНІРОВАЧНАГА ТЭСТА</u> ”ІМЕННЫЯ Ч. М.” (у камп’ютарах <u>у</u> <u>праграме</u> <u>Moodle</u>).

5. Падрыхтавацца **да электроннага варыянта** <u>тэставай</u> <u>КАНТРОЛЬНАЙ</u> <u>РАБОТЫ</u> <u>№ 2</u> па тэме: **”Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік”** (у камп’ютарах <u>у</u> <u>праграме</u> <u>Moodle</u>).

Падрыхтаваць выкладчыку пытанні па дамашніх заданнях (калі ў чым.-н. сумняваліся ці што-н. не зразумелі).

## <u>Аўдыторныя</u> <u>заданні</u>:

1. Перад пачаткам к. / р. задаць выкладчыку пытанні, калі што-н. не зразумелі ў дамашніх заданнях.

Репозиторий ВГУ

2. Выканаць **электронныя варыянты** тэставай **КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 2** па тэме **”Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік”** (у камп’ютарах у праграме Moodle).

## Літаратура да тэмы № 16:

Гл. літаратуру да тэм № № 11 - 15.

## Дамашняе заданне да экзамена:

1. Паўтарыць усе тэмы і яшчэ раз выканаць **электронныя варыянты** ПРОБНАГА ТЭСТА **”ЛГР назоўнікаў. Р., л., скл., скланенне”** і ТРЭНІРОВАЧНАГА ТЭСТА **”Іменныя ч. м.”** (у камп’ютарах у праграме Moodle).

2. Выканаць некалькі разоў электронны варыянт **тэста** **”Экзамен. Іменныя ч. м. УСЯ БАЗА”** не менш чым **на 90 % !!!**

Репозиторий ВГУ